УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# КАЎКА АЛЯКСЕЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ

**ГІСТОРЫК, ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦА, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ**

**20 ВЕРАСНЯ 1937 Г. – 21 САКАВІКА 2024 Г.**

**ФОНД № 340**

**ВОПІС № 1**

**1950–2005,**
**коп. асобных дакументаў за 1610 – [сяр. 1930-х гг.]**

**МІНСК 2005**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 340**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА. | | 1 - 10 |
| 1. | РУКАПІСЫ А. К. КАЎКІ. | 1- 175 | 1 - 23 |
| 1.1. | ДЫСЕРТАЦЫІ, МАНАГРАФІІ. | 1 - 23 | 1 - 4 |
| 1.2 | ЗБОРНІКІ АРТЫКУЛАЎ. | 24 - 28 | 4 |
| 1.3. | АРТЫКУЛЫ. | 29 - 93 | 4 - 13 |
| 1.4. | РЭЦЭНЗІІ, ВОДГУКІ, ЗАЎВАГІ. | 94 - 110 | 13 - 16 |
| 1.5. | ДАКЛАДЫ, ВЫСТУПЛЕННІ. | 111 - 142 | 16 - 20 |
| 1.6. | ДЗЁННІКАВЫЯ ЗАПІСЫ. | 143 - 175 | 20 - 23 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ РЭДАКТАРСКАЙ І ЎКЛАДАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ А. К. КАЎКІ. | 176 - 205 | 23 - 27 |
| 2.1. | ЛІТАРАТУРНА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ГАДАВІК "СКАРЫНІЧ". | 176 - 192 | 23 - 25 |
| 2.2. | ЗБОРНІКІ НАВУКОВЫХ КАНФЕРЭНЦЫЙ. | 193 - 205 | 25 - 27 |
| 3. | ПЕРАПІСКА. | 206 - 464 | 27 - 44 |
| 3.1. | ЛІСТЫ А. К. КАЎКІ. | 206 - 265 | 27 - 32 |
| 3.1.1. | ЛІСТЫ А. К. КАЎКІ ДЗЕЯЧАМ ЛІТАРАТУРЫ І КУЛЬТУРЫ. | 206 - 240 | 27 - 29 |
| 3.1.2. | ЛІСТЫ А. К. КАЎКІ РОДНЫМ І ЗНАЁМЫМ. | 241 - 253 | 29 - 30 |
| 3.1.3. | ЛІСТЫ А. К. КАЎКІ ВА ЎСТАНОВЫ, РЭДАКЦЫІ ЧАСОПІСАЎ І ГАЗЕТ. | 254 - 265 | 30 - 32 |
| 3.2. | ЛІСТЫ ДА А.К. КАЎКІ. | 266 - 464 | 32 - 42 |
| 3.2.1. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ ГІСТОРЫКАЎ, ДЗЕЯЧАЎ ЛІТАРАТУРЫ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ. | 266 - 335 | 32 - 36 |
| 3.2.2. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ З РАСІІ. | 336 - 349 | 36 - 37 |
| 3.2.2.1. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ ГІСТОРЫКАЎ, НАВУКОЎЦАЎ І ДЗЕЯЧАЎ КУЛЬТУРЫ РАСІІ. | 336 - 341 | 36 |
| 3.2.2.2. | ЛІСТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў РАСІІ. | 342 - 349 | 36 - 37 |
| 3.2.3. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ З УКРАІНЫ, ЛАТВІІ, ЛІТВЫ. | 350 - 365 | 37 - 38 |
| 3.2.4. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ З ПОЛЬШЧЫ. | 366 - 376 | 38 - 39 |
| 3.2.5. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ З АЎСТРАЛІІ, БАЛГАРЫІ, ВЯЛІКАБРЫТАНІІ, ГЕРМАНІІ, ЗША, ФРАНЦЫІ, ЧЭХІІ. | 377 - 384 | 39 |
| 3.2.6. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ АД РОДНЫХ. | 385 - 440 | 39 - 40 |
| 3.2.7. | ЛІСТЫ ДА А. К. КАЎКІ СЯБРОЎ І ЗНАЁМЫХ. | 411 - 436 | 40 - 42 |
| 3.3. | ЛІСТЫ А. К. КАЎКУ АД ВЫДАВЕЦТВАЎ, РЭДАКЦЫЙ ЧАСОПІСАЎ І ГАЗЕТ, УСТАНОЎ. | 437 - 464 | 42 - 44 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А. К. КАЎКІ | 465 - 562 | 44 - 56 |
| 4.1. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ. | 465 - 497 | 44 - 48 |
| 4.2. | ДАКУМЕНТЫ СЛУЖБОВАЙ І НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ. | 498 - 521 | 48 - 53 |
| 4.3. | ДАКУМЕНТЫ ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ А. К. КАЎКІ. | 522 - 562 | 53 - 56 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ ПРА А. К. КАЎКУ. | 563 - 570 | 56 - 57 |

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| 6. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ А. К. КАЎКАМ ДЛЯ СВАІХ ПРАЦ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ. | 571 - 949 | 57 - 100 |
| 6.1. | ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ ПОЛЬШЧЫ І БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ СУВЯЗЯХ. | 571 - 605 | 57 - 61 |
| 6.2. | ДАКУМЕНТЫ ПА СКАРЫНАЗНАЎСТВУ. | 606 - 654 | 61 - 66 |
| 6.3. | ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ. | 655 - 733 | 66 - 75 |
| 6.4. | ДАКУМЕНТЫ ДА ГІСТОРЫІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА РУХУ Ў БЕЛАРУСІ 1980-Х - 1990-Х ГГ. | 734 - 755 | 75 - 78 |
| 6.5. | ДАКУМЕНТЫ Б. І. ЭПІМАХ-ШЫПІЛЫ, САБРАНЫЯ ДЛЯ ПУБЛІКАЦЫІ Ў "СКАРЫНІЧУ", ВЫП. 1. | 756 - 759 | 78 - 79 |
| 6.6. | ДАКУМЕНТЫ К. Б. ЕЗАВІТАВА. | 760 - 771 | 79 - 80 |
| 6.7. | ДАКУМЕНТЫ М. М. УЛАШЧЫКА. | 772 - 779 | 80 - 81 |
| 6.8. | ДАКУМЕНТЫ Ю. Б. ТУРОНКА. | 780 - 790 | 81 - 83 |
| 6.9. | ЛІСТЫ РОЗНЫХ АСОБ, УСТАНОЎ І ВА ЎСТАНОВЫ. | 791 - 805 | 83 - 85 |
| 610 | ДАКУМЕНТЫ ПА ГІСТОРЫІ ЎКРАІНЫ І БЕЛАРУСКА-УКРАІНСКІХ СУВЯЗЯХ. | 806 - 817 | 85 - 87 |
| 611 | ДАКУМЕНТЫ ПРА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ У РАСІІ, УКРАІНЕ, ПРЫБАЛТЫЦЫ І ІНШ. КРАІНАХ 1980-Х -- 1990-Х ГГ. | 818 - 830 | 87 - 88 |
| 612 | АРТЫКУЛЫ, НАТАТКІ, ВЫСТУПЛЕННІ, УСПАМІНЫ І ІНШ. ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ ЛІТАРАТУР, БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ. | 831 - 861 | 88 - 92 |
| 613 | ДАКУМЕНТЫ ПРА МАСТАЦТВА І КУЛЬТУРУ БЕЛАРУСІ. | 862 - 873 | 92 - 93 |
| 614 | ДАКУМЕНТЫ ПА РУСКАЙ І ЗАМЕЖНАЙ ФІЛАСОФІІ І РЭЛІГІІ. | 874 - 897 | 93 - 96 |
| 615 | ЗАПІСНЫЯ КНІЖКІ А. К. КАЎКІ З ЗАПІСАМІ ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ. | 898 - 937 | 96 -100 |
| 616 | АФІШЫ І ПРАГРАМЫ СПЕКТАКЛЯЎ, КАНЦЭРТАЎ, ФЕСТЫВАЛЯЎ, КАНФЕРЭНЦЫЙ. | 938 - 949 | 99 - 100 |
| 7 | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ. | 950 - 1025 | 100 - 107 |
| 7.1 | ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ФАТАГРАФІІ А. К. КАЎКІ І Ў ГРУПАХ. | 950 - 991 | 100 - 103 |
| 7.2. | ФАТАГРАФІІ ДЗЕЯЧАЎ КУЛЬТУРЫ. | 992 - 999 | 104 |
| 7.3. | ФАТАГРАФІІ, САБРАНЫЯ А. К. КАЎКАМ ДА СВАІХ РАБОТ І ПА ЦІКАВЫХ ДЛЯ ЯГО ТЭМАХ. | 1000 - 1025 | 104 - 107 |

## Прадмова

**Каўка Аляксей Канстанцінавіч** (псеўд. К. Атрашэўскі, К. Каваль, А. Канстанцінаў, А. Лямец, К. А., А. К.) нарадзіўся 20 верасня 1937 г. у вёсцы Равецкі Бор (цяпер в. Машчаліна) Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Маці Ганна Маркаўна памерла рана, у 1938 г., бацька Кастусь Васільевіч Каўка загінуў на фронце на пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Гадаваўся старэйшымі сёстрамі, а з 1948 г. – у дзіцячым доме № 3 г. Чэрвеня. Вучыўся спачатку ў пачатковай школе в. Машчаліна, скончыў сем класаў Беларускай сярэдняй школы г. Чэрвеня (цяпер Беларускі ліцэй імя Караля), потым паступіў у Мінскі бібліятэчны тэхнікум (1951 – 1954 гг.). Пасля яго заканчэння працаваў у сельскай бібліятэцы в. Вялікаполле Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Адначасова ўзначальваў камсамольскую арганізацыю калгаса "Перадавік", потым працаваў інструктарам Чэрвеньскага РК ЛКСМ па зонах Замастоцкай і Лядзенскай МТС. У 1955 – 1961 гг. вучыўся на завочным аддзяленні беларускай мовы і літаратуры БДУ. У 1956 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. Служыў спачатку ў палітаддзеле штаба 3 танкавай арміі, а затым 18 механізаванай арміі старшым бухгалтарам па забеспячэнню палітпрасветамуніцыяў вайсковых адзінак. Улетку 1959 г. дэмабілізаваны і прызначаны інструктарам Чэрвеньскага райкама КПБ, у хуткасці абраны другім, першым сакратаром РК ЛКСМ гэтага ж раёна. У 1963 г. – сакратар Мінскага абкама ЛКСМБ. У маі 1965 г. быў запрошаны ў апарат ЦК ВЛКСМ на пасаду адказнага арганізатара па сувязях з маладзёжнымі арганізацыямі Польшчы. З гэтага часу жыве ў Маскве. У 1968 – 1971 гг. вучыўся ў аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС на кафедры міжнароднага камуністычнага і рабочага руху. У 1971 г. абараніў дысертацыю "Вопросы социалистического патриотизма и интернационализма в идеологической деятельности Польской объединенной рабочей партии (1966 – 1970 гг.)" на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. У 1971 – 1979, 1983 – 1987 гг. працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара Польшчы ў Інстытуце эканомікі сусветнай сацыялістычнай сістэмы АН СССР. Па сумяшчальніцтву чытаў лекцыі ў Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК КПСС (1974 – 1977 гг.) З 1979 г. па 1982 г. працаваў у Варшаве прадстаўніком Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурных сувязей з замежжам (ССОД), радцам пасольства СССР у ПНР (1979-1983). Быў вядучым навуковым супрацоўнікам Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР і адначасова галоўным рэдактарам часопіса "Советское славяноведение" (1987 – 1989 гг.). З 1989 г. па 2004 г. працаваў вядучым навуковым супрацоўнікам Інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага РАН. У 1991 г. абараніў дысертацыю па кнізе-манаграфіі "Тут мой народ: Франтишек Скорина и белорусская литература XVI – начала XX вв. Проблема преемственности" на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. З канца 1980-х гг. удзельнічае ў беларускім руху Адраджэння ў якасці аднаго з заснавальнікаў, старшыні (1988-1990) Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны, дэлегата устаноўчых з'ездаў БНФ "Адраджэнне", Таварыства беларускай мовы, Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, намеснікам старшыні Аргкамітэта па ўтварэнню Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (МАБ), віцэ-старшыні Маскоўскага рэгіянальнага аб'яднання МАБ, дэлегата I-IV з'ездаў беларусаў свету "Бацькаўшчына" (Сябра Галоўнай Рады Згуртавання); выступаў у беларускім друку па злабадзённых пытаннях грамадскага пратэсту беларускай мовы, узнаўлення нескажонай гістарычнай памяці, належных адносін да нацыянальна-культурнай спадчыны, паўнацэннага, нескажонага развіцця беларускай навуковай думкі., Міжнароднага фонду Янкі Купалы. З'яўляўся арганізатарам шматлікіх мерапрыемстваў і канферэнцый, прысвечаных 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны.

Узнагароджаны ганаровымі адзнакамі ЦК ВЛКСМ "За активную работу в комсомоле" (1968), ССОД – "За вклад в дело дружбы" (1983), сярэбраным медалём Таварыства польска-савецкай дружбы (1982), медалём Францыска Скарыны (1990), "Ветеран труда",

“850 лет Москвы”, ганаровымі дыпломамі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына”.[1]

У сваіх працах А. К. Каўка даследаваў гісторыю Польшчы, польскага рабочага руху, савецка-польскіх адносінаў. Ім быў напісан шэраг прац, артыкулаў, рэцэнзій і выступленняў па гэтай тэматыцы: “Вопросы патриотизма и социалистического интернационализма в деятельности ПОРП” (1972), “Польская Народная Республика” (1974), “На пути возрождения (30 лет Народной Польше) (1974), «Польша: Отечество и социализм” (1977), “Укрепление дружбы и сотрудничества между СССР и ПНР” (1977), “Экономическое сотрудничество СССР и Польшы” (1978), “Варшава: непокоренная и возрожденная” (1980), “Роль общества польско-советской дружбы в распространении польской культуры в СССР” і інш. З канца 1970-х гг. засяродзіўся на праблемах беларускага адраджэння: “Letter to a Russian friend. Письмо русскому другу» (Лондан, 1979), “Проблемы Белоруссии в современной польской историографии” (1980), “Иван Луцкевич. К 100-летию со дня рождения ”, “Якімі скарбамі багаты. Развагі над зводным каталогам “Кніга Беларусі” (1990), “Што трэба ведаць кожнаму беларусу?” (1991), “Беларускі вызваленчы рух. Спроба агляду” (1991), “Мэта - нацыянальнае адраджэнне” (1993), “Лічыць даказаным. З гісторыі узбуйнення БССР” (1994), “Белорусское возрождение в историко-культурном контексте” (1996), “Беларуская марсельеза” в традициях национального просветительства” (2000) і інш. Шмат пісаў і выступаў пра Ф. Скарыну і на скарыназнаўчыя тэмы: манаграфія “Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI – пачатку XX стст.”, артыкулы “Патрыятычныя погляды Францішка Скарыны” (1984), “Паходня абуджанай памяці. Францішак Скарына і новая беларуская літаратура (дакастрычніцкі перыяд)” (1987), ”Францишек Скорина. Социально-этнические аспекты творчества” (1988), “О национальном мировидении Францишека Скорины” (1993), “О просветительстве Скорины” (1994) і інш. Таксама вывучаў жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча, К. Б. Езавітава, М. І. Каспяровіча, Я. Купалы, А. І. і І. І. Луцкевічаў, М. М. Улашчыка, Б. І. Эпімаха-Шыпілы і інш. Апублікаваў “Нарысы з беларускай гісторыі” В.Ластоўскага (часопіс “Спадчына” № 4-6, 1996 г.). У 1997 г. выйшаў зборнік гісторыка-літаратурных нататкаў “Жывом! Старонкамі беларускага самапазнання”, а ў 1998 г. як працяг - “Будам жыць! Пра тое самае”. А. К. Каўка з’яўляецца ўкладальнікам літаратурна-навуковага штогодніка “Скарыніч” (выпуск 1-5, 1991 - 2002), адзін са складальнікаў бібліяграфічнага даведніка “М. М. Улашчык” (1996), выдання матэрыялаў навуковай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю М. М. Улашчыка “Русь – Литва – Беларусь. Проблемы национального самосознания в историографии и культурологии” (1996), укладальнік і аўтар прадмовы да выдання “Мікалай Улашчык. Выбранае” з серыі “Беларускі кнігазбор” (2001).[2] На сённяшні час вядзецца праца па выданню манаграфіі “Белорусская литература конца XIX – начала XX вв. в контексте национального возрождения”.

Дакументы А. К. Каўкі паступілі ў БДАМЛМ ад самаго навукоўца ў 1988, 1989, 1998 гг.
У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі фонду быў складзены вопіс №1 у колькасці 1026 спраў (12 038 дакументаў) за 1950 - 2005 гг., копіі асобных дакументаў за 1610 – [сяр.1930-х гг.]
Вопіс складаецца з 7 раздзелаў.

1. Раздзел “Рукапісы” уключае 6 падраздзелаў, сфарміраваных па значнасці жанраў, унутры справы змешчаны па храналогіі.

[1]Гл. таксама: Адз.зах.134, 466,474, 475
[2] Гл. таксама: Адз.зах.504.

1.1. У падраздзел увайшлі дысертацыі, манаграфіі: “Вопросы социалистического патриотизма и интернационализма в идеологической деятельности польской объединенной рабочей партии (1966 – 1970 гг.)” – варыянт, прадстаўлены машынапісам з нязначнымі праўкамі (1971), “Польша: Отечество и социализм” – вёрстка з аўтарскімі і рэдактарскімі праўкамі (1976), “Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI – пачатку XX стст.” – 10 варыянтаў, аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай і праўкамі А. В. Мальдзіса, М. М. Улашчыка, С. А. Шупы, вёрстка (1984 - 1988), аўтарэферат названай дысертацыі – 2 варыянта на беларускай і рускай мовах, аўтограф, машынапіс з аўтарскімі праўкамі, друкаванае выданне (1991), асобныя главы, план-канспект і заяўкі на выданне манаграфіі “Белорусская литература конца XIX – начала XX вв. В контексте национального возрождения” – варыянт, аўтограф, машынапіс з аўтарскімі праўкамі (1989 - 2001).

1.2. У падраздзел увайшлі зборнікі артыкулаў: “Жывом! Старонкамі беларускага самапазнання”=”Беларусамі становяцца” – варыянт, аўтограф, машынапіс з аўтарскімі праўкамі (1997), “Будам жыць! Пра тое самае” – варыянт, машынапіс з аўтарскімі праўкамі, уклейкі друкаваных выразак (1998).

1.3.  Сюды ўвайшлі варыянты артыкулаў па польскай тэматыцы: “Новые явления в социально-политическом развитии ПНР” (1975), “Проблемы предотвращения декабрьского (1970) кризиса в ПНР” (1971), “О фашистской провокации в Катынском лесу” (1972) і інш.; пра гісторыю беларускіх студэнцкіх гурткоў канца XIX – пачатку XX стст. (1977 - 1985), на беларускія нацыянальныя тэмы: “Ад тутэйшасці – да нацыянальнасці” (1983), “Адносіны да роднай мовы як этычныя праблемы” (1987), “Белорусская марсельеза в контексте национального просветительства” (2000), “Маладая Беларусь: нацыянальная ідэя, ідэал” (2002) і інш. (1976 – 2000); артыкулы, напісаныя для энцыклапедый літаратуры і мастацтва Беларусі, гісторыі Беларусі, “Францыск Скарына і яго час” (1984 - 1989); артыкулы пра С. Х.Александровіча, Ф. Багушэвіча, М. А. Багдановіча, К. Б. Езавітава, Г. А. Каханоўскага, Я. Коласа, Я. Купалу, І. І. Луцкевіча, А. Міцкевіча, Б. А.  Тарашкевіча, М. М. Улашчыка, Б. І. Эпімах-Шыпілу і інш. (1981 – 2005), пра Ф. Скарыну і скарыназнаўчую тэматыку 34 (1984 – [1992]), пра беларускі нацыянальна-вызваленчы рух і эміграцыю (1988 - 2001), дзейнасць Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны (1989 - 1998). Усяго 312 артыкулаў за 1955 – 2005 гг.

1.4. Падраздзел склалі варыянты рэцэнзій на выданне “Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі” (1977), энцыклапедычны даведнік “Янка Купала” (1977 - 1981), кнігі Я. Брыля, З. Верас, выданне “Кніга Беларусі. 1517 – 1917. Зводны каталог”, “Этнаграфія беларусаў. Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя” і інш. (1977 - 1988), рукапісы кніг і манаграфій Ю. Я. Барабаша, Г. Я. Галенчанка, І. Дварчаніна, І. Т. Лісевіч, К. Тарасава інш. (1984 – 1998), кінафільм Я. Габрыловіча і Ю. Райзмана “Станная женщина” (1978); водгукі на кандыдацкія дысертацыі, даклады, аўтарэфераты З. У. Карава, Г. В. Кісялёва, Е. Кшышавяка, Ю. С. Новапашіна, В. П. Рагойшы і інш. (1978 - 2005), рукапісы артыкулаў для БелСЭ (1983 - 1994); заўвагі, удакладненні да энцыклапедый “Францыск Скарына і яго час”, гісторыі Беларусі, паказальніка літаратуры “Францыск Скарына. Жыццё і дзейнасць” і інш. (1984 - 1994).

1.5. Падраздзел складаюць варыянты дакладаў і выступленняў аб дзейнасці УЛКСМ у Беларусі (1965), пра Ф. Скарыну (1985 – 1998), беларускае нацыянальнае адраджэнне (1982 - 1990), расійска–беларускія адносіны (1988 - 1999), праблемы беларускай літаратуры (1987 - 2005) і інш. У гэтым жа падраздзеле змешчаны варыянты вершаў А. К. Каўкі: “Брату-славяніну”, “Беларусі”, “Вступление”, “Жывом!”, “Неўміручасці нашай

скрыжалі”, “Песня герою”, “Развітальнае”, “Сейбіт у хаце” і інш., прысвечаныя жонцы С. І. Каўцы, У. Каралькову, Г. В. Кісялёву, А. В. Мальдзісу, А. С. Разанаву і інш. (147) – аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай, выразкі з газеты (1952 - 2001); аўтабіяграфіі (6) – аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, аўтарызаваны машынапіс (1953 - 2005); інтэрв’ю з Н. С. Гілевічам, Е. Озгі-Міхальскім, С. М. Станютай, М. М. Улашчыкам, І. П. Шамякіным, і інш. (1978 - 1998); анкета “Ф. Скарына і беларуская літаратура” (1986 - 1987); запісы ўспамінаў М. І. Астроўскай, Н. А. Тарашкевіч, М. М. Улашчыка (1983 – 1987).

1.6. Сюды ўвайшлі блакноты з дзённікавымі запісамі 42 (1952 - 1999); невялікую групу склалі пераклады А. К. Каўкам урыўкаў паэмы А. Т. Твардоўскага “Василий Теркин” (1977 - 1988), вершаў Ф. Багушэвіча, Г. М. Бураўкіна, А. А. Блока, Л. А. Геніюш, Н. С. Гілевіча, Б. Пастэрнака, А. С. Пушкіна і інш. (15) (1987 - 2001); запісныя кніжкі з вершамі, дзённікавымі запісамі і інш. – 4 (1970 - 1976).
Храналагічныя рамкі раздзела – 1952 – 2005 гг.

2. Раздзел “Дакументы рэдактарскай і ўкладальніцкай дзейнасці А. К. Каўкі” складаюць два падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па храналогіі.

2.1. Сюды ўвайшлі 5 выпускаў літаратурна-публіцыстычнага гадавіка “Скарыніч”: выпуск 1 – варыянты, аўтограф, машынапіс са значнымі праўкамі, рукапіс А. К. Каўкі (1990); выпуск 2 – варыянты, аўтограф, машынапіс з рэдактарскімі праўкамі Г. В. Кісялёва, Б. Белаказовіча, машынапіс з аўтарскімі праўкамі (1991, [1993]); выпуск 3 – машынапіс з рэдактарскімі праўкамі А. К. Каўкі, аўтограф Р. П. Платонава і інш. (1996); выпуск 4 – варыянт, аўтограф Р. П. Платонава, машынапіс з рэдактарскімі праўкамі В. У. Скалабана, аўтарызаваны машынапіс з праўкамі У. М. Конана і інш. (1999); выпуск 5 – аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскімі праўкамі, ксеракопіі і выразкі з часопісаў і газет і інш. (2002).

2.2. У падраздзеле змешчаны зборнікі навуковых канферэнцый: ”Великою ласкою. Францишек Скорина в традициях славянского просветительства”. Матэрыялы навуковай канферэнцыи, прысвечанай 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны – няпоўны тэкст, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс, машынапіс з рэдактарскай праўкай (1990); “Франциск Скорина и традиции гуманизма в славянской культуре” – варыянт, машынапіс, даклады І. В. Анічэнкі, Б. Белаказовіча, С. С. Купцова, Ю. А. Лабынцава, Е. Л. Неміроўскага і інш. – аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, рукапіс А. К. Каўкі і інш. (1990); падборка артыкулаў да зборніка “Мікалай Улашчык. Выбранае” – няпоўны тэкст, машынапіс, машынапіс з аўтарскімі праўкамі, ксеракопіі з кніг, часопісаў з рэдактарскімі праўкамі, рукапіс В. У. Скалабана, ксеракопія аўтографа М. М. Улашчыка, В. У. Быкава і інш. (2001).

3. Раздзел “Перапіска” утвараюць лісты А. К. Каўкі (1952 – 2000), лісты да А. К. Каўкі (1952 – 2000), лісты выдавецтваў, рэдакцый часопісаў і газет устаноў (1959 – 2000). Справы ў іх размяшчаюцца па алфавіту прозвішчаў адрасатаў і карэспандэнтаў (унутры спраў - па храналогіі). У тэматычных групах 3.1.2, 3.1.3. справы сістэматызаваны па храналогіі.

3.1. Падраздзел “Лісты А. К. Каўкі” (1952 – 2000) складаецца з трох тэматычных груп дакументаў. Сюды увайшлі чарнавікі лістоў А. К. Каўкі дзеячам літаратуры і культуры (3.1.1) С. Х. Александровічу, Г. М. Бураўкіну, Н. С. Гілевічу, А. П. і В. П. Грыцкевічам, Г. В. Запартыцы, У. С. Караткевічу, Г. А. Каханоўскаму, К. Т. Мазураву, А. С. Лісу, У. М. Конану, А. І. Мальдзісу, А. А. Марачкіну, В. Г. Мацкевічу, Г. М. Сагановічу, В. У.

Скалабану, Г. І. Сурмач, В. С. Талстому, К. І. Тарасаву, Ю. Б. Туронку, А. І. Ціхановіч, С. А. Шупу, Я. Я. Янушкевічу і інш., а таксама В. Жыдліцкаму, Ф. Сакаловай, Ф. Сяліцкаму, Я. Д. Ісаевічу і інш. дзеячам Польшчы, Украіны, усяго 115 адрасатаў за 1977 – 1999 гг.; лісты родным і знаёмым (3.1.2) (1952 – 1998) – 7 адрасатаў; лісты ва ўстановы, рэдакцыі (3.1.3) (1959 – 2000). Усяго ў гэты раздзел увайшлі лісты да 166 адрасатаў.

3.2. Падраздзел уключае тры групы дакументаў: лісты да А. К. Каўкі гісторыкаў, дзеячаў літаратуры і культуры Беларусі (1968 – 2000 гг.) – С. Х. Александровіча, У. А. Анічэнкі, У. А. Арлова, А. М. Белакоза, А. Я. Белага, Д. Я. Бічэль-Загнетавай, Я. Брыля, А. М. Гесь, Н. С. Гілевіча, А. П. Грыцкевіча, М. І. Ермаловіча, У. М. Казберука, Г. А. Каханоўскага, У. М. Конана, У. С. Ліпскага, А. І. Мальдзіса, У. І. Мархеля, Л. П. Мірачыцкага, М. Х. Плавінскага, А. М. Пяткевіча, Г. М. Сагановіча, Я. Саламевіча, В. У. Скалабана, М. Скоблы, В. С. Талстога, М. Танка, Г. Тварановіч, А. І. Ціхановіч, З. Шыбекі, В. Ц. Якавенкі, Я. Я. Янушкевіча і інш. Падраздзел (3.2.2.) складаюць лісты гісторыкаў, навукоўцаў і дзеячаў культуры Расіі – С. І. Бэлзы, Ю. А. Лабынцава, Я. Л. Неміроўскага, І. А. Паўлоўскага, В. П. Суханава, І. В. Ухваронка і лісты прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Расіі – А. Баркоўскага, Г. М. Гарэцкай, В. В. Голуба, В. П. Грыцкевіча, А. С. Катлярчука, М. Нікалаева і інш.; лісты да А. К. Каўкі з Украіны, Латвіі, Літвы – В. І .Дудко, М. Зімомры, І. В. Капотчанкі, С. П. Плачынды, Л. А. Луцкевіча і інш.; лісты да А. К. Каўкі з Польшчы – А. Бергман, Е. Вайшчука, А. Ротусь, Ф. Сяліцкага, Ю. Б. Туронка і інш.; лісты да А. К. Каўкі з Аўстраліі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Францыі, Чэхіі (3.2.5.) – Ю. Васілеўскага, В. Кіпеля, М. Сяднёва, Р. Жук-Грышкевіч і інш.; лісты да А. К. Каўкі ад родных (3.2.6.); лісты да А. К. Каўкі сяброў і знаёмых (3.2.7.).
Усяго ў гэты раздзел увайшлі лісты ад 295 карэспандэнтаў.

3.3. Раздзел склалі лісты выдавецтваў БелСЭ, “Беларускі кнігазбор”, “Мастацкая літаратура”, “Полымя” і інш., рэдакцый газет “Вячэрні Мінск”, “Голас Радзімы”, “Звязда”, “ЛіМ”, “Наша ніва” і інш., рэдакцый часопісаў “Беларускі гістарычны агляд”, “Беларусь”, “Нёман”, “Полымя” і інш., лісты Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа АН БССР, супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі, расійскіх і беларускіх архіваў, маскоўскіх выдавецтваў, часопісаў і газет, Акадэміі навук БССР, Згуртавання беларусаў свету “Бацькаўшчына”, Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, лісты Рады БНР і інш. установаў, а таксама у раздзел увайшлі візітныя карткі навукоўцаў, дырэктараў, пісьменнікаў з Вялікабрытаніі, Германіі, Польшчы, Расіі і інш. краін.

4. Раздзел “Дакументы да біяграфіі А. К. Каўкі” складаецца з 3-х падраздзелаў. Справы ў падраздзелах сістэматызаваны па храналогіі.

4.1 У падраздзел “Асабістыя дакументы” увайшлі дакументы аб узнагароджванні памятным медалём “Дарогамі бацькоў-герояў”, польскімі залатымі ганаровымі значкамі ([1970] - 1982) і інш.; аўтабіяграфіі А. К. Каўкі (6) (1954 – [1997]); дакументы аб вучобе ў БДУ (1957 - 1961); асабістыя лісткі па ўліку кадраў, анкеты, характарыстыкі і інш. (1963 - 2000); запрашальныя білеты розных установ, творчых союзаў і інш. (1951 - 2000); запісная кніжка з пажаданнямі, фатаграфіямі і адрасамі аднапалчан (1959); запісныя кніжкі з тэлефоннымі нумарамі і адрасамі родных, сяброў, знаёмых 13 (1963 – [1990-я] гг.) і інш.

4.2. У падраздзел “Дакументы службовай і навуковай дзейнасці” увайшлі дакументы аб вучобе ў аспірантуры Акадэміі навук пры ЦК КПСС (1968 - 1975); дакументы абароны кандыдацкай дысертацыі (1971), доктарскай дысертацыі (1991); дакументы аб рабоце ў Інстытуце эканомікі сусветнай сацыялістычнай сістэмы (1972 - 1986), прадстаўніком Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі ў ПНР, саветнікам пасольства СССР у ПНР (1972 - 1986), галоўным рэдактарам часопіса

“Советское славяноведение” (1986 - 1988), у Інстытуце славяназнаўства і балканістыкі АН СССР (1987 - 1989), у Інстытуце сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага РАН (1989 - 2000), бібліяграфія і спісы навуковых твораў ([1982] - 2005), дакументы навуковых канферэнцый і скарынінскіх выставак, прысвечаных 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны, 480-годдзю беларускага кнігадруку (1986 - 1999), 90-годдзю М. М. Улашчыка (1995 - 1996); заяўкі выдавецтва “Беларуская энцыклапедыя” імя П. Броўкі на напісанне і рэцэнзіраванне артыкулаў (1988 - 1996), запісныя кніжкі па службовых пытаннях 40 (1960 – [1990-я гг.]) і інш.

4.3. Падраздзел “Дакументы грамадскай дзейнасці А. К. Каўкі” захоўвае дакументы дзейнасці Маскоўскага таварыства беларускай культуры імя Ф. Скарыны (1988 – [1998]); дакументы аб удзеле А. К. Каўкі ў мерапрыемствах, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння Ф. Багушэвіча (1990), навуковых канферэнцыях, якія праводзіліся Згуртаваннем беларусаў свету “Бацькаўшчына”, Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам Ф. Скарыны і інш. (1990 - 2000); дакументы дзейнасці Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Маскоўскай асацыяцыі беларусістаў (1990 – 2000); дакументы I, II, IV з’ездаў беларусаў свету з удзелам А. К. Каўкі (1993 – 2005); юбілейныя дакументы ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння А. К. Каўкі (1997).
Храналагічныя рамкі раздзела – 1950 – 2005 гг.

5. У раздзел “Дакументы пра А. К. Каўку” увайшлі па значнасці жанраў артыкулы, нататкі пра А. К. Каўку і з упамінаннем пра яго; адказы на анкеты газет “Комсомольская жизнь”, “Правда”, часопісаў “Весьнік беларускай гісторыі”, “Нёман” і інш.; рэцэнзіі О. Ф. Ішуцінай, Н. Каламейчыка, С. Хойнецкай і інш. на манаграфію “Польша: Отечество и социализм”, рэцэнзіі У. А. Арлова, Г. А. Каханоўскага, У. М. Конана, А. В. Мальдзіса, на рукапіс кнігі “Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура”, рэцэнзіі, водгукі, заключэнні на рукапіс кнігі “От Скорины до Купалы. О белорусском возрождении”; інтэрв’ю А. К. Каўкі. Храналагічныя рамкі раздзела 1963 – 2004 гг.

6. Дакументы, сабраныя А. К. Каўкам для сваіх прац і па цікавых для яго тэмах складаюць значную частку вопісу. Раздзел уключае ў сябе 16 падраздзелаў, справы ў якіх сфарміраваныя па тэматычнаму прынцыпу, а ўнутры падраздзелаў па значнасці жанраў і храналогіі. Пераважная частка дакументаў прадстаўлена выразкамі з часопісаў, газет і ксеракопіямі.

6.1. Тут прадстаўлены дакументы па гісторыі Польшчы, гістарычныя, культурныя беларуска-польскія сувязі. Гэта нарысы Т. Кура “Dawne kresy Rzechpospolitej”, К. Піварскага “Opozycja litewska pod koniec XVII vieku”, В. Барташэўскага “Polskie panstvo podziemne 1939 – 1945”, Г. Лаўмяньскага “Studia nad dziejami Wielkiego Ksiestva Litewskiego” і інш., артыкулы і нататкі  А. Дзяругі “Z dziejow sprawy bialoruskiej w latach 1917 – 1918”, Е. Тамашэўскага “Kresy wschodie w polskiej mysli politychnnej XIX-XX w.”, Е. Охмяньскага “Polskie badanie nad dziejami Bialorusi epoki feudalizmu”, М. Слівы “Federalizm i autonomia narodovosciowa w mysli Miedziakowskiego”, артыкулы з часопіса “Kultura”  з аглядам беларускага культурнага жыцця і інш, выступленні С. Каня пра дзейнасць Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Т. Хрусцялеўскага “Artyzm poezii Jakuba Kolasa”, артыкулы, нататкі і інтэрв’ю з лідэрамі прафсаюзнага руху Польшчы, узоры плакатаў “Салідарнасці”, выпіскі на тэму беларуска-польскіх сувязяў, дзейнасці Польскай рабочай партыі і інш. Храналагічныя рамкі раздзела 1920—1994 гг.

6.2. Падраздзел складаюць дакументы па скарыназнаўству: нарысы П. В. Уладзімірава “Докторъ Франциск Скорина”, А. В. Флароўскага “Чешская библия в истории русской культуры и письменности”, Ф. Сяліцкага “Literatura bialoruska do konca XVIII vieku” і

інш., а таксама артыкулы пра жыццёвы і творчы шлях Ф. Скарыны, яго ролю ў гісторыі і культуры Беларусі, артыкулы і нататкі пра паслядоўнікаў друкара, пра ўрачыстасці і падрыхтоўку да іх з нагоды 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны; рэцэнзіі А. І. Жураўскага на артыкулы П. Векслера, А. Макміліна, Х. Ротэ пра Ф. Скарыну; адказы дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі, Украіны, Польшчы, рабочых і служачых, студэнтаў на анкету, прысвечаную Ф. Скарыне, складзеную А. К. Каўкам; выпіскі па скарынінскай тэматыцы. Дакументы за 1888 – 1994 гг.

6.3. Тут знаходзяцца гістарычныя нарысы М. К. Любаўскага “Областное дъеленіе и мъстное управленіе Литовско-русскаго государства ко времени изданія перваго литовского статута”, “Очеркъ истории Литовско-русского государства до люблинской унии включительно”, М. В. Доўнар-Запольскага “Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягелонах”, У. М. Ігнатоўскага, А. І.Смоліча “Белоруссия”, С. Барысёнка “Нацыянальны характар Літоўскага статуту 1529 г.”, А. В. Станкевіча “Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення”, Л. Рыдлеўскага “L’histoire de la Bielorussie”, Ю. Васілеўскага “Нарыс гісторыі беларускіх студэнцкіх арганізацыяў 20-х гадоў у Маскве”, асобныя старонкі дысертацый У. М. Конана, С. В. Снапкоўскай, артыкулы пра дзейнасць А. і І. Луцкевічаў, беларускія студэнцкія гурткі, утварэнне БНР, БССР і інш. падзеі ў гісторыі Беларусі, артыкулы Ц. Гартнага па палітычнай гісторыі, В. Д. Дружчыца “Магістрат у беларускіх местах з майдэборскім правам у XV-XVII сталецьцях”, С. Калеко “Земельные отношения в Белоруссии до переворота 1917 года” і інш., рэферат В. Ярашэвіча “Krotki zarys zagadnienia bialoruskiego”, няпоўныя тэксты лекцый па беларусазнаўству, прачытаныя ў Беларускім народным універсітэце (Масква) У. І. Пічэтам, М. А. Янчуком і інш.; дакументы пра Ўсебеларускі з’езд, спіс рукапісных кніг Віленскага беларускага музея; аўтарэфераты дысертацый Н. Л. Улейчык, У. М. Конана, В. У. Скалабана, Г. П. Тварановіч, А. С. Катлярчука; дакументы пра дзейнасць БСГ, дзённік А. І. Луцкевіча, паказанні падследных (У. М. Ігнатоўскага, І. Красоўскага, В. Ю. Ластоўскага, І. Ю. Лёсіка, П. В. Мядзёлкі), біяграфічныя звесткі Б. А. Тарашкевіча пра сябе, дакументы Ф. Т. Канстанцінава, М. А. Пяткевіча; выпіскі на гістарычныя тэмы. Храналагічныя рамкі раздзела 1885 – 1999 гг.

6.4. Сюды ўвайшлі гістарычны нарыс Л. Валовіча “Национальное “адраджэньне” Белоруссии: возможные пути и перспективы”, артыкулы з аглядам грамадска-палітычных працэсаў у Беларусі к.1980-х – пач. 1990-х гг., артыкулы і нататкі пра беларускія суполкі, таварыствы, арганізацыі, артыкулы З. Пазняка, С. С. Шушкевіча, праекты праграм па адраджэнню беларускай мовы і гісторыі, газеты палітычных партый, арганізацый, стэнаграмы выступленняў удзельнікаў мітынгаў, сходаў, статуты таварыстваў, дакументы дзейнасці БНФ і інш. Храналагічныя рамкі падраздзела 1980 – 1999 гг.

6.5. Тут знаходзяцца дакументы Б. І. Эпімаха-Шыпілы за 1891 – 1999 гг.: яго інфармацыя “Беларуская мова ў гімназіі”, аўтабіяграфія, паказанні, лісты Л. М. Клейнбарту, Е. Р. Раманаву; артыкулы, нататкі, рэферат і інш. А. В.Станкевіча, Р. М. Семашкевіча, Я. Я. Янушкевіча і інш. пра Б. І. Эпімаха-Шыпілу; выпіскі.

6.6. Падраздзел склалі капійныя дакументы К. Б. Езавітава з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь: артыкулы (“Религиозная жизнь белорусского народа”, “Сяргей Сахараў”, “Францішак Алекна-Аляхновіч” і інш.), яго аўтабіяграфія, каталог беларускіх кніг з бібліятэкі К. Б. Езавітава, лісты К. Б. Езавітава М. С. Абрамчыку, Ф. Аляхновічу, Л. А. Войцік, А. В. і Я. В. Станкевічам, Р. Р. Шырму, лісты М. Абрамчыка, Я. Найдзюка, С. П. Сахарава і інш., дыпламатычны пашпарт К. Б. Езавітава, дакументы пра К. Б. Езавітава, а таксама артыкулы Т. Грыба, даклад Я. Мамонькі “На ўзломе”, статут Лігі Эпфорт,

вершы А. Салаўя, яго кароткі жыццяпіс; выпіскі А. К. Каўкі пра К. Б. Езавітава. Храналагічныя рамкі падраздзела 1919 – 1995 гг.

6.7. У падраздзеле сабраны навуковыя артыкулы М. М. Улашчыка (“Кобринская экономия после проведения волочной померы”, “О крестьянских волнениях в Литве в первой половине XIX в.”, “О количестве земли, полученной крестьянами Белоруссии и Литвы при отмене крепостного права”, “Литовская и Жемойтская хроника” и ее отношение к хроникам Быховца и М. Стрыйковского”, рэцэнзіі, водгук, заўвагі, успаміны пра В. Ю. Ластоўскага; аўтабіяграфія М. М.Улашчыка, бібліяграфія прац М. М. Улашчыка, артыкулы, водгукі, інфармацыі М. М.Улашчыка за 1975 – 1996 гг, успаміны Я. Брыля, А. Н. Нарбута, Ф. Сяліцкага пра яго і інш. дакументы. Храналагічныя рамкі падраздзела 1947 – 1998 гг.

6.8. Падраздзел утварылі дакументы Ю. Б. Туронка за 1976 – 1993 гг., сістэматызаваныя па значнасці жанраў: яго доктарская дысертацыя “Беларусь пад нямецкай акупацыяй”, навуковае даследаванне “Kwestia bialoruska w politycy obozu londynskiego (1941-1944), гістарычныя нарысы “Bialoruska sprawa wydawnicha w latach 1902-1905” і інш., артыкулы “Wokol genezy dziadzki Antona”, “Geneza i dzialnosc Bialoruskiej Centralnej rady (grudzen 1943 – czewiec 1944)”; ліст Л. І. Луцкевічу, М. І. Забэйды-Суміцкага да яго, жыццяпіс Ю. Б. Туронка, бібліяграфія яго прац і інш., выпіскі Ю. Б. Туронка з дакументаў па гісторыі беларускага пытання ў пач. 1900-х гг.; дакументы А. Калубовіча (Я. Т. Каханоўскага): нарысы, дакументы пра яго, фатаграфія, сабраныя Ю. Б. Туронкам.

6.9. Тут па алфавіту прозвішчаў, а ўстаноў па храналогіі, знаходзяцца машынапісныя копіі, ксеракопіі лістоў розных асоб, устаноў і ва ўстановы - гэта лісты М. І. Гарэцкага Я. Ф. Карскаму 4 (1920 – 1927), Р. Жук-Грышкевіч, М. Сяднёва Л. І. Пранчаку 2 [1990-я гг.], У. С. Караткевіча А. М. Макараву 4 (1960), А. І. Смоліча Л. А. Сівіцкай, Б. А. Тарашкевічу 4 (1914 – 1916), М. А. Янчука А. І. Пыпіну 2 (1894), ліст Н. С. Гілевіча, В. Ф. Карамазава міністру сацыяльнага забеспячэння (1985), членаў Саюза мастакоў Беларусі членам Палітбюро ЦК КПСС 2 (1986), дзеячаў культуры, літаратуры, гісторыкаў М. С. Гарбачову 4 (1986 – 1988) і інш.

6.10. Сюды ўвайшлі дакументы па гісторыі Ўкраіны і беларуска-украінскіх сувязях, размешчаныя па значнасці жанраў: нарыс Д. Дарашэнкі “Білорусы і іх національне відродження”, артыкулы пра гісторыю, вядомых асобаў Украіны з перыядычнага друку, гістарычны нарыс М. П. Драгаманава “Историческая Польша и великорусская демократия”, артыкулы С. М. Злупко, Р. Іванчанкі і інш. пра М. П. Драгаманава; артыкулы М. С. Грушэўскага і інш., выпіскі з прац М. С. Грушэўскага , М. П. Драгаманава. Храналагічныя рамкі падраздзела 1905 – 1997 гг.

6.11. У падраздзеле знаходзяцца артыкулы, нататкі пра грамадска-палітычнае жыццё ў Расіі, Украіне, Прыбалтыцы і інш. краінах, а таксама інфармацыйныя бюлетэні літоўскага руху перабудовы, Народнага фронта Латвіі, адкрыты ліст групы чэхаславацкіх дзеячаў да грамадзян сваёй краіны з антыкамуністычнымі заклікамі і інш. за 1968 – 1995 гг.

6.12. У падраздзел па значнасці жанраў і храналогіі ўвайшлі артыкулы пра ролю інтэлігенцыі ў культуры і гісторыі народа, артыкулы, нататкі, успаміны пра Я. Купалу, М. Багдановіча, артыкулы В. У. Быкава пра шлях Беларусі, артыкулы пра грамадска-палітычную сітуацыю ў рэспубліцы, артыкулы і нататкі пра беларускую мову, працэс беларусізацыі, развіццё сучаснай беларускай літаратуры і літаратуразнаўства; артыкулы, нататкі, інтэрв’ю з У. С. Караткевічам, уступнае слова У. С. Караткевіча да рукапіснай кнігі А. Бембеля “Мова і маральна-эстэтычны прагрэс”, аўтарэферат А. В. Мальдзіса

"Закономерности развития белорусской литературы переходного периода (вторая половина XVII-XVIII в.)"; рукапісныя варыянты тэкстаў М. І. Гарэцкага да "Гісторыі беларускай літаратуры", "Беларуская бібліяграфія", складзеная Р. А. Зямкевічам з надпісам і паметамі М. І. Гарэцкага; выступленні А. Макміліна, С. Грачыоцці на Х міжнародным кангрэсе славістаў у Сафіі; успаміны і выступленне А. А. Бабарэкі пра бацькоў; вершы Р. І. Барадуліна, Н. С. Гілевіча, Н. І. Мацяш і інш., выпіскі пра беларускую літаратуру, творчасць Я. Коласа, Я. Купалы. і інш.; артыкулы і нататкі пра шляхі рускай літаратуры, артыкулы і нататкі пра А. Блока, Ф. М. Дастаеўскага, Л. М.Талстога, выпіскі пра рускую літаратуру і філасофію (А. Блока, А. Белага, В. Брусава, А. Пушкіна, У. Салаўёва, С. Трубяцкога і інш.). Храналагічныя рамкі падраздзела [1919] – 1999 гг.

6.13. У падраздзеле змешчаны па храналогіі дакументы пра мастацтва і культуру Беларусі – артыкулы У. І. Сядуры, М. М. Шчакаціхіна і інш., дакументы пра М. І. Забэйду-Суміцкага (праграмка, артыкулы, нататкі), дакументы І. А. Няборскага (лісты, артыкулы пра Натальеўскі хор, запрашэнне, праграмкі), вершы, эпіграма В. П. Суханава, тэксты песен, сабраныя Н. А. Янчуком, саната Л. К. Шлег "Слуцкие письмена", лісты К. Буйло, У. М. Дубоўкі, К. Голуба, М. М. Улашчыка да вучняў Гудзевіцкай сярэдняй школы і інш. за 1927 – 1989 гг.

6.14. Тут па значнасці жанраў і па храналогіі сістэматызаваны дакументы па філасофіі і рэлігіі за 1889 – 1997 гг.: "Матэр'ялы да гісторыі беларускае праваслаўнае царквы (пэрыяд савецкай і нямецкай акупацыі Беларусі)" А. Мартаса, няпоўныя тэксты філасофскіх прац М. А. Бярдзяева, К. М. Лявонцьева, В. В. Розанава, С. М. Трубяцкога, праца М. Ф. Фёдарава "Философия общего дела", манаграфія М. Абрэнбскага "Biblia – problema do rozsybrowania. Prawdy "objawione a rzeczywistascie", артыкулы на царкоўную тэматыку, у тым ліку артыкулы з газеты "Новы шлях", пра царкоўнае жыццё беларусаў на чужыне з перыёдыкі замежжа; дакументы Беларускай каталіцкай грамады, выступленне А. Мірановіча "Язафат Дубянецкі – гісторыя цудатворнай іконы Жыровіцкай Божай Маці", тэзісы Н. Мячкоўскай "Мова і рэлігія", артыкул А. Надсана "Акафіст найсвяцейшай Багародзіцы", "Часлаў Сіповіч у памяці", артыкулы і нататкі пра А. Надсана, дыярыуш Ч. Сіповіча, артыкулы М. Куліковіча пра царкоўную музыку ў Беларусі, партытура сціхіры для хору "Хваліце Госпада з нябёсаў", "Беларускі духоўны сьпеўнік" пад рэд. А. Клімовіча і Г. Піхуры, аб'ява пра выхад кнігі "Островоротная или Остробрамская чудотворная икона Богородицы въ городъ Вильнъ" (1883) і інш., выпіскі А. К. Каўкі па рэлігійнай тэме.

6.15. Тут па храналогіі змешчаны запісныя кніжкі, блакноты А. К. Каўкі з запісамі па цікавых для яго тэмах, з бібліяграфіяй да сваіх работ, выпіскі з кніг і архіўных дакументаў для сваіх прац, а таксама тэматычная картатэка з выпіскамі да прац А. К. Каўкі (беларусізацыя, польская тэматыка, культура, беларуская інтэлігенцыя, беларускае адраджэнне, М. Багдановіч, Я. Колас, В. Ластоўскі, А. Луцкевіч, А. Станкевіч, Б. Тарашкевіч і інш.), бібліяграфія па гісторыі беларускага друку, бібліятэчныя патрабаванні з бібліятэк Вялікабрытаніі, Літвы, Польшчы, Расіі, канспекты двухмесячных курсаў пры партыйнай школе ЦК КПБ, твораў рускай літарутуры. Храналагічныя рамкі падраздзела 1958 – 1998 гг.

6.16. У падраздзеле па храналогіі змешчаны афішы і праграмы спектакляў, канцэртаў, фестываляў, канферэнцый з дароўнымі надпісамі ўдзельнікаў, з запісамі А. К. Каўкі; афішы дзён беларускай літаратуры ў Польшчы, рэкламны плакат аб выданні энцыклапедычнага даведніка "Францыск Скарына і яго час", афіша выстаўкі

“Скарыніяна” да 500-годдзя Ф. Скарыны, праграмы спектакляў маскоўскіх і мінскіх тэатраў і інш. за 1958 – 2000 гг.

7. Раздзел “Выяўленчыя дакументы” складаецца з 3 падраздзелаў.

7.1. Тут знаходзяцца індывідуальныя фатаграфіі А. К. Каўкі 61 (1953 - 1998), у групах з дзеячамі літаратуры і мастацтва Беларусі, Польшчы: В. У. Быкавым, Г. М. Бураўкіным, З. Верас, М. І. Ермаловічам, У. М. Конанам, А. С. Лісам, Л. Луцкевічам, А. В. Мальдзісам, Л. П. Мірачыцкім, З. С. Пазняком, В. П. Рагойшам, М. Танкам, Г. Я. Тумашам, С. С. Шушкевічам і інш.; з роднымі, з сябрамі і знаёмымі; з рознымі дэлегацыямі, у маладзёжных і міжнародных лагерах, на з’ездах Саюза сацыялістычнай моладзі ў Польшчы ў час работы адказным арганізатарам міжнароднага аддзела ЦК ЛКСМБ; з афіцыйнымі дэлегацыямі ў час мерапрыемстваў дружбы і культурных сувязяў з заграніцай і пасольства СССР у Польшчы; фатаграфіі сяброў, знаёмых з дароўнымі надпісамі А. К. Каўку; фатаграфіі кадра з фільма “Чатыры танкісты і сабака”, касманаўтаў М. Гермашэўскага, П. І. Клімука, архітэктара І. І. Валадзько, рэжысёра У. Коласа з дароўнымі надпісамі. Усяго 358 фатаграфій за 1950 – 2000 гг.

7.2. Сюды ўключаны фатаграфіі дзеячаў культуры: В. У. Адамчыка, М. І. Ермаловіча, А. С. Ліса, А. В. Мальдзіса, А. А. Марачкіна, Ю. Озгі-Міхальскага, З. С. Пазняка, М. Танка, Ю. Б. Туронка, І. Г. Чыгрынава і інш. 73 ([сяр. 1990-х гг.] - 1989).

7.3. Падраздзел уключае фатаграфіі, сабраныя да сваіх работ і па цікавых для фондаўтваральніка тэмах. Гэта копіі фатаграфій П. А. Бадуновай, В. Ю. Ластоўскага, А. І. Луцкевіча, А. М. Уласава, Б. І. Эпімах-Шыпілы, К. Б. Езавітава з беларускімі палітычнымі дзеячамі, вайскоўцамі, вучнямі і інш. 9 (1918 – 1929, [1946]), кс. Станкевіча (1927), Н. А. Арсеневай 2 (1955, 1976), Б. А. Тарашкевіча 2 ([1916]); выяўленчыя дакументы да 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны; экслібрысы М. М. Купавы, В. М. Целеша, В. Ф. Шматава; фатаграфіі рэпрадукцый твораў А. А. Марачкіна; фатаграфіі вокладак кніг Я. І. Хлябцэвіча “Народническая поэзия белорусов” (1917), Я. Купалы “Huslar” (1910), А. Смоліча “Геаграфія Беларусі” (1919) – копіі 1990-х гг.; фатаграфіі пасляваеннага Берліна 4 (1958); буклеты “Полацк”, “Софийский собор – памятник архитектуры XI – XIII вв.” і інш. Храналагічныя рамкі раздзела ([1910-я] – 2001 гг.).

Навуковае апісанне 1, 2, 4, 5, 7 раздзелаў зрабіла С. Г. Буель, 3, 6 – Н. М. Чэрнік-Рымашэўская.

Прадмову склалі вядучыя архівісты — Н. М. Чэрнік-Рымашэўская, С. Г. Буель

12.09.2005

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ А. К. КАЎКІ.** | | | | |
| | **1.1. ДЫСЕРТАЦЫІ, МАНАГРАФІІ.** | | | | |
| 1 | "Вопросы социалистического патриотизма и интернационализма в идеологической деятельности польской объединенной рабочей партии (1966 - 1970 гг.)". Кандыдацкая дысертацыя. Варыянт.<br>Машынапіс з нязначнымі праўкамі. | 1971 | 280 | 1 | |
| 2 | "Польша: Отечество и социализм". Манаграфія.<br>Вёрстка з аўтарскімі і рэдактарскімі праўкамі.<br>Прыкладзены выразкі з газет, запісы да тэмы. | 1976 | 127 | 1 | |
| 3 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Варыянт.<br>Агульны сшытак, асобныя старонкі. | 1984 -- 1985 | 174 | 1 | |
| 4 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст.".<br>Дысертацыя-манаграфія. Асобныя главы.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1984 -- 1986 | 185 | 1 | |
| 5 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Варыянты.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1985 -- 1986 | 120 | 1 | |
| 6 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Варыянт.<br>Агульны сшытак, асобныя старонкі. | 1986 | 87 | 1 | |
| 7 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Варыянт.<br>Агульны сшытак, асобныя старонкі. | 1986 -- 1987 | 146 | 1 | |
| 8 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Пачатак.<br>Няпоўны тэкст.<br>Машынапіс з аўтарскімі праўкамі і праўкамі А. В. | 1986 | 97 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Мальдзіса, М. М. Улашчыка. | | | | |
| 9 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XI - пачатку XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Працяг. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі і праўкамі А. В. Мальдзіса, М. М. Улашчыка. | 1986 | 104 | | |
| 10 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Заканчэнне. Машынапіс з аўтарскімі прiаўкамі і праўкамі А. В. Мальдзіса і М. М. Улашчыка. | 1986 | 110 | | |
| 11 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Пачатак. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі. | 1986 -- 1988 | 97 | 1 | |
| 12 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Працяг. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі. | 1988 | 106 | | |
| 13 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Заканчэнне. | 1988 | 122 | | |
| 14 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская дакастрычніцкая літаратура". Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Пачатак. Няпоўны тэкст. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі і праўкамі А. В. Мальдзіса, М. М. Улашчыка. | 1988 | 107 | 1 | |
| 15 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская дакастрычніцкая літаратура". Дысертацыя-манаграфія. Варыянт. Заканчэнне. Няпоўны тэкст. Машынапіс з аўтарскімі праўкамі і праўкамі А. В. Мальдзіса і М. М. Улашчыка. | 1988 | 174 | | |
| 16 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст." Дысертацыя-манаграфія. Выдавецкі экзэмпляр. Няпоўны тэкст. Варыянт. Пачатак. Прыкладзена заключэнне А. В. Мальдзіса на рукапіс кнігі. Машынапіс з рэдактарскай праўкай С. А. Шупы. | 1988 | 87 | 2 | |
| 17 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская | 1988 | 97 | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | літаратура XVI - пачатку XX стст.".<br>Дысертацыя-манаграфія. Выдавецкі экзэмпляр.<br>Працяг. Няпоўны тэкст.<br>Машынапіс з рэдактарскай праўкай С. А. Шупы. | | | | |
| 18 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія. Выдавецкі экзэмпляр.<br>Няпоўны тэкст. Варыянт. Заканчэнне.<br>Машынапіс з рэдактарскай праўкай С. А. Шупы.<br>У канцы прыкладзены надпісы да ілюстрацый. | 1988 | 144 | | |
| 19 | "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI - пачатку XX стст."<br>Дысертацыя-манаграфія.<br>Вёрстка з рэдактарскімі праўкамі С. А. Шупы, аўтарскімі паметамі А. К. Каўкі.<br>Прыкладзены фотаілюстрацыі. | 1988 | 296 | 1/25 | |
| 20 | "Обретение памяти. Белорусская литература конца XVIII - XIX вв. Проблема возрождения", "Возрождение белорусской культуры в XIX - начале XX вв.: проблема типологизации" і інш. Асобныя главы з манаграфіі "От Скорины до Купалы. Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения". Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1989 -- 1996 | 114 | 1 | |
| 21 | "Здесь мой народ. Францишек Скорина и белорусская литература XVI - начала XX вв."<br>Аўтарэферат манаграфіі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Чарнавы варыянт.<br>Аўтограф. | 1991 | 49 | 1 | |
| 22 | "Францишек Скорина и белорусская литература XVI - начала XX вв." Аўтарэферат дысертацыі-манаграфіі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Варыянты.<br>Машынапіс з аўтарскімі праўкамі, друкаванае выданне. | 1991 | 73 | 2 | |
| 23 | "От Скорины до Купалы. Белорусская литература в контексте национально-культурного возрождения".<br>Манаграфія. Заяўка на выданне, асобныя главы.<br>Варыянты. Няпоўны тэкст.<br>Аўтограф, машынапіс, машынапіс з аўтарскімі праўкамі. | 1998 -- 2005 | 76 | - | |

**1.2 ЗБОРНІКІ АРТЫКУЛАЎ.**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 24 | "Жывом! Старонкамі беларускага самапазнання." = "Беларусамі становяцца." Гісторыка-літаратурныя нататкі. Пачатак. Варыянт.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай.<br>Прыкладзена заключэнне Я. Р. Лецкі на рукапіс кнігі - аўтарызаваны машынапіс. 1996. | 1997 | 109 | 2 | |
| 25 | "Жывом! Старонкамі беларускага самапазнання."="Беларусамі становяцца." Гісторыка-літаратурныя нататкі. Працяг. Варыянт.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1997 | 102 | | |
| 26 | "Жывом! Старонкамі беларускага самапазнання."="Беларусамі становяцца." Гісторыка-літаратурныя нататкі. Варыянт. Заканчэнне.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1997 | 149 | | |
| 27 | "Будам жыць! Пра тое самае". Зборнік артыкулаў. Пачатак. Варыянт.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, уклейкі друкаваных выразак. | 1998 | 146 | 1 | |
| 28 | "Будам жыць! Пра тое самае". Зборнік артыкулаў. Заканчэнне. Варыянт.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, уклейкі друкаваных выразак. | 1998 | 115 | | |
| | **1.3. АРТЫКУЛЫ.** | | | | |
| 29 | Артыкулы пра бібліятэчную і камсамольскую работу ў в. Вялікаполле Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Варыянты.<br>Аўтограф, выразка з газеты. | 1955 -- 1956 | 7 | 5 | |
| 30 | "Новые явления в социально-политическом развитии ПНР", "Проблемы предотвращения декабрьского (1970) кризиса в ПНР". Артыкулы. Варыянты.<br>Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1971, 1975 | 82 | 2 | |
| 31 | "О фашистской провокации в Катынском лесу", "Пшиязнь на цо дзень". Артыкулы. Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскімі праўкамі. | 1972 -- 1981 | 26 | 4 | |
| 32 | "Письмо русскому другу". Артыкул пра беларускую мову, культуру і гісторыю. Варыянты. На англ. і рус. м.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай, ксеракопія аўтографа, брашура з аўтарскімі праўкамі. | 1976 -- 1979 | 73 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 33 | "Беларус смяецца", "Беларуская марсельеза в контексте национального просветительства", "Шлях да Айчыны" і інш. Артыкулы. Варыянты. Некаторыя артыкулы - няпоўны тэкст.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай, ксеракопія з газеты. | 1976 -- 2000 | 71 | 16 | |
| 34 | Артыкулы пра гісторыю беларускіх студэнцкіх гурткоў канца XIX - пачатку XX стст. Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс з аўтарскай праўкай, вёрстка. Да вёрсткі "З братняю Руссю..." прыкладзены ліст у рэдакцыю часопіса "Маладосць" ад 23.06.1978 г. - чарнавік. | 1977 -- 1985 | 83 | 8 | |
| 35 | "Гаманіла Украіна, бараніла мовы...", прадмова да зборніка "Бригантина", "Русская советская литература в отечественном и мировом контексте (трудности исследования)" і інш. Артыкулы. Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1978 -- 1989 | 25 | 4 | |
| 36 | "Польскія вучоныя аб гісторыі Беларусі", "У вольным горадзе Менску", "У Маскве аб беларускіх старадруках" і інш. Артыкулы. Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай, выразка з часопіса. | 1980 -- 1999 | 21 | 6 | |
| 37 | Артыкулы і выступленне пра І. І. Луцкевіча. Варыянты.<br>Аўтограф, аўтарызаваны машынапіс, машынапіс з аўтарскай праўкай. | 1981 -- 1991 | 29 | 5 | |
